«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Брэст: суд пакараў удзельнікаў агітацыйнага пікету аднаго з кандыдатаў у дэпутаты

12.03.2014 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, выбары-2014



Лідэр Брэсцкай абласной арганізацыі АГП Уладзімір Вуек аштрафаваны на 25 базавых велічынь, а актывісты гэтай партыі Дыяна Касцюковіч і Юры Жыдовіч - на 10 базавых велічынь кожны.

Яны былі пакараны за пікет, які быў ініцыяваны Аб'яднанай грамадзянскай партыяй і адбыўся на вуліцы Савецкай у Брэсце 24 лютага. Тады, нягледзячы на выказаныя супрацоўнікамі праваахоўных органаў заўвагі, што акцыя ладзіцца ў месцы, якое рашэннем гарадскіх уладаў не можа выкарыстоўвацца для пікетавання, абышлося без затрыманняў. Аднак міліцыянты перапісалі пашпартныя дадзеныя ўдзельнікаў пікета і неўзабаве на іх былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні за правядзенне несанкцыянаванага масавага мерапрыемства. Суд пагадзіўся з высновамі супрацоўнікаў міліцыі і аштрафаваў актывістаў АГП.

“Мы спасылаліся на Асноўны закон, а менавіта на артыкул 35 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе права на мірныя сходы, мітынгі, шэсці, - распавёў Уладзімір Вуек. - Аднак суд гэта праігнараваў нашы аргументы, як не стаў ўлічваць і палажэнні выбарчага заканадаўства, якое дазваляе правядзенне падобных мерапрыемстваў у агітацыйны перыяд - бо гэта быў менавіта пікет нашага кандыдата ў дэпутаты. Акрамя таго, суд не прыняў да ўвагі той факт, што мы папярэдзілі Брэсцкі гарвыканкам аб дадзеным мерапрыемстве і ніхто нам адтуль не паведаміў, што гэта рабіць забаронена. Да таго ж менавіта на гэтым месцы, на вуліцы Савецкай, нядаўна ладзілі свой пікет актывісты іншай палітычнай партыі - БСДП (Грамада), і ніякіх перашкод не было” .

“Праваабаронцы за свабодныя выбары”

Опубликовать







грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Заява аб прызнанні 13 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жанчыну асудзілі па фота з Маршаў, якія захаваліся на воблачным сховішчы яе тэлефона



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 27 сакавіка па 11 красавіка

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 12 па 27 сакавіка

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Гэтыя каштоўнасці не прыбраць". Як экс-палітвязні святкавалі Дзень волі ў няволі



ГАЛОЎНАЕ

Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"





АПОШНІЯ НАВІНЫ

У брэсцкім СІЗА памёр Аляксандр Кулініч, якога абвінавачвалі ў абразе Лукашэнкі

"Следчая адвярнулася да сцяны і заплакала". Гісторыя пенсіянера, якога асудзілі па даносе суседа за ўдзел у пратэстах

Затрыманні журналіста, прадпрымальніка, старшыні АСВОДа: хроніка пераследу 13-15 красавіка (дапоўнена)

Зорку "Што? Дзе? Калі?" Фёдара Шведава ў Гродне судзяць за данаты (дапоўнена)

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Музыкаў гурта Nizkiz асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі"

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

